# АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ НАВУКОВАГА КІРУНКУ ДАСЛЕДАВАННЯ «ГІСТОРЫЯ ФЕАДАЛЬНЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ» Ў АЙЧЫННАЙ НАВУЦЫ

# SCIENTIFIC SCHOOLS OF STUDY OF PROCESSES OF URBANIZATION OF PERIOD OF FEUDALISM ON EARTH OF BELORUSSIA : HISTORIOGRAPHY ASPECT

*Врублеўскі Ю. У., БДПУ (Мінск)*

*Vrublevski Y. V.*

У артыкуле разгледжана станаўленне і развіццё айчынных навуковых даследаванняў па праблемах гісторыі гарадскога жыцця на Беларусі эпохі феадалізму. Галоўным паказчыкам фарміравання новага кірунку сталі абароненыя кандыдацкія і доктарскія дысертацыі па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя і археалогія».

In the article, becoming and development of home scientific schools is considered on the problems of research of municipal life in Belorussia of epoch of feudalism. The protected candidate's and doctoral dissertations became the main criterion of determination of scientific school on history of municipal range of problems within the framework of certain direction of research.

*Ключавыя словы:* навуковая школа, гістарыяграфія, феадальны горад, дысертацыйныя даследаванні.

*Keywords:* scientific school, historiography, feudal city, dissertation researches.

Тэма гарадоў і праблематыка гарадской гісторыі доўгія часы прыцягвала ўвагу розных даследчыкаў (гісторыкаў, філосафаў, культуролагаў, сацыёлагаў, эканамістаў і інш.) і працягвае заставацца адной з актуальных у нашы дні. Цікавасць да адзначанай праблемы тлумачыцца як самім феноменам горада і яго супярэчлівай сутнасцю, так і той роляй, якую ён выконвае ў жыцці кожнага грамадства. Не выключэннем стала і беларуская гістарыяграфія. Сёння магчыма канстатаваць факт існавання некалькіх значных кірункаў даследавання гарадской гісторыі Беларусі. Па-першае, гэта гісторыя раннесярэдневяковых гарадоў, якая прадстаўлена, галоўным чынам, даследаваннямі археолагаў (гісторыя гарадоў Полацкай зямлі, гарадоў Тураўскай зямлі, Панямоння і інш.). Даволі значны кірунак даследаванняў уяўляе сабой гісторыя горада позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Акрамя таго, у гістарычных даследаваннях вылучаецца і праблема фадальнага горада. У апошнія часы цікавасць навукоўцаў выклікаюць праблемы генезісу капіталізму і месца гоарада ў дадзеным працэсе. Кожны з названых кірункаў адрозніваецца як праблематыкай узнімаемых пытанняў, так і тэматычнай шматграннасцю яе вывучэння.

Прапануемы артыкул сканцэнтруе ўвагу чытача на асаблівасцях фарміравання ў гістарычнай навуцы Беларусі такога навуковага кірунку, як гісторыя феадальных гарадоў. Вылучэнне гісторыкамі такой навуковай праблемы ў ранг гістарыяграфічнай з'явы латрабуе свайго асэнсавання.

Фарміраванне ўрбаністычнага кірунку даследавання ў айчыннай навуцы пачало здзяйсняцца як пад уплывам першых і значных археалагічных раскопак старажытнабеларускіх гарадоў, якія пачалі праводзіцца ў 1920 г., і краязнаўчага руху, так і ў выніку назапашвання новых гістарычных крыніц, якія пачалі ўводзіцца ў навуковы ўжытак. Навуковую цікавасць да шматгранных праблем гарадской гісторыі пачалі праяўляць вучні У. І. Пічэты: В. Д. Дружчыц, Д. І. Даўгяла, Т. У. Забела, – якія ўсё часцей пачалі ўзнімаць у сваіх працах пытанні зараджэння і развіцця гарадоў Беларусі. Пры гэтым неабходна высветліць, што ўяўлялі сабой першыя навуковыя працы гісторыкаў па гісторыі феадальных гарадоў у 1920–1940 гг. і чым яны адрозніваліся ад прац папярэднікаў. Па-першае, у гэты час адбываецца змена гістарыяграфічных парадыгм (адбываецца канчатковае станаўленне марксісцкай гістарыяграфіі). Па-другое, пашыраецца тэматыка даследаванняў феадальнага горада (больш увагі стала надавацца пытанням сацыяльнай і эканамічнай гісторыіі, асаблівасцям культурнага асяродка жыхароў гарадоў), што было выклікана развіццём крыніцазнаўчай базы. Па-трэцяе, у БССР пачалі зараджацца першыя навукова-акадэмічныя школы вывучэння гарадоў. Тым самым у гістарычнай навуцы быў зроблены важны крок да замацавання сістэматычных даследаванняў беларускіх гарадоў.

З 1950–1980-х гг. пачынаецца якасна новы перыяд развіцця кірунку даследаванняў феадальных гарадоў Беларусі. У гэты час з'яўляюцца першыя абагульняльныя даследаванні, прысвечаныя праблематыцы феадальнага горада. Пачынаюць абараняцца кандыдацкія і доктарскія дысертацыі па гісторыі гарадоў Беларусі. Прычым, асаблівасцю гэтага кірунку на дадзеным этапе становіцца ўсталяванне дзвюх навуковых школ: археалагічнае вывучэнне горада і гістарычнае даследаванне сацыяльна-эканамічнай гісторыі горада. Адметнасць археалагічных даследаванняў датычылася, як правіла, выяўлення і інтэрпрэтацыі дадзеных у межах зараджэння феадальных адносін (XI–XIII стст.) і асэнсаванні ролі гарадоў у працэсе зараджэння інстытутаў феадалізацыі і ранняй дзяржаўнасці. Гістарычныя даследаванні сацыяльна-эканамічнай гісторыі федальных гарадоў канцэнтраваліся галоўным чынам вакол праблематыкі часоў развітога ці позняга феадалізму. У канцы 1970-х гг. упершыню пачалі ўзнімацца пытанні генезісу капіталізму (працы А. М. Лютага). Гэта стане першым крокам да з'яўлення новага кірунку даследаванняў, а затым і стварэння новай навуковай школы (вывучэнне праблем генезісу капіталізму і ўрбанізацыі і фарміравання беларускай нацыі). Дадзены навуковы кірунак пачне фарміравацца ў пачатку 90-х гг. XX ст.

*Археалагічныя даследаванні litарадоў:*

Загорульский, Э. М. Древний Минск (Историко-археологический очерк) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / Э. М. Загорульский ; АН БССР, Ин-т истории, БГУ им. В. И. Ленина. – Минск, 1963.

Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / Г. В. Штыхов ; Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т истории. – Минск, 1965.

Драгун, Ю.И. Социально-экономическое развитие белорусского города в XI–XVIII вв.: (По материалам Орши) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Ю. И. Драгун ; БГУ им. В.И. Ленина. – Минск, 1969.

Лысенко, П. Ф. Города Туровской земли : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / П. Ф. Лысенко ; Ин-т истории Акад. наук БССР. – Минск, 1971. – 24 с.

Левко, О. Н. Витебск XIV–XVIII вв.: (По археологическим материалам) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / О. Н. Левко ; Ленингр. гос. ун-т им. А. А. Жданова. – Л., 1980.

Заяц, Ю. А. Заславль (Изяславль) X–XVIII вв. Хронология и социально-историческая топография : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / Ю. А. Заяц. – Минск, 1989.

*Гістарычныя даследаванні сацыяльна-эканамічнай гісторыі гарадоў:*

Щербаков, С. А. Города Западной Белоруссии в составе Речи Посполитой в первой половине XVII века : автореф. дис. ... канд. ист. наук / С. А. Щербаков. – Львов, 1958.

Мелешко, В. И. Социально-экономическое развитие и политическая жизнь Могилева во второй половине XVI – первой половине XVII вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук / В. И. Мелешко. – Минск, 1960.

Игнатенко, А. П. Основные черты экономического развития городов Белоруссии в XVII–XVIII вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. П. Игнатенко. – Минск : Высшая школа, 1963.

Адащик, Ф. И. Экономическое развитие белорусского города в XVII – первой поповине XIX вв.: на материалах Витебска : автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Ф. И. Адащик. – Минск, 1969.

Колысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1966. – 227 с.

Драгун, Ю. И. Социально-экономическое развитие белорусского города в XI-XVIII вв.: (По материалам Орши): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Ю. И. Драгун. – Минск, 1969.

Карпачев, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в.: автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / А. М. Карпачев. – Минск, 1970.

Вишневский, А. Ф. Социапьно-экономическое развитие городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30–50-е гг. XIX в.); автореф. дис. ... канд ист. наук: 07.00.02 / А. Ф. Вишневский – Минск, 1973.

Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой трети XIX в.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. М. Лютый. – Минск, 1979.

Грицкевич, А. П. Социально-экономическое развитие частновладельческих городов Белоруссии в XVI–XVIII веках : автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02 / А. П. Грицкевич. – Вильнюс, 1984.

З набыццём краінай дзяржаўнага суверэнітэту ў 1991 г. пачынаецца новы (сучасны) этап у развіцці далейшых напрамкаў даследавання гарадоў Беларусі. На іншы гістарычны і метадалагічны ўзровень выходзяць працы гісторыкаў-урбаністаў. Сваёй творчай навуковай дзейнасцю па-ранейшаму працягваюць займацца мэтры сучаснай гістарычнай навукі – П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў, Э. М. Загарульскі, О. М. Ляўко, А. М. Люты. Так, пачынаюць узнікаць новыя кірункі гістарычных даследаванняў – праблема генезісу капіталізму, працэсаў урбанізацыіі і фарміраванне беларускай нацыі; праблема фарміравання тэрытарыяльна-адміністрацыйных цэнтраў Усходняй Беларусі. У гэты час (пераважна 1990-я гг.) пачынаюць з'яўляцца новыя імёны маладых гісторыкаў, якія прысвяцілі сваю плённую навуковую дзейнасць прблемам гісторыі гарадоў. Сярод іх Ю. А. Заяц, Л. У. Калядзінскі, А. А. Мяцельскі, Г. М. Семянчук, А. А. Макушнікаў, І. А. Марзалюк, А. К. Краўцэвіч. Сёння гэта буйныя гісторыкі, некаторыя з іх дактары гістарычных навук. Да новага пакалення гісторыкаў-урбаністаў магчыма аднесці дактароў гістарычных навук, маладых навукоўцаў: Д. У. Дука (навуковы кіраўнік – Г. В. Штыхаў) і С. П. Стрэнкоўскага (навуковы кіраўнік – А. М. Люты), якія працягваюць займацца абранай імі гістарычнай праблематыкай.

*Сучасныя дысертацыйныя даследаванні па праблемах гарадской гісторыі Беларусі:*

Дук, Д. У. Матэрыяльная культура насельніцтва Полацка XVI–XVIII стст. (па выніках археалагічнага вывучэння): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.06 / Д. У. Дук ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2004.

Дук, Д. У. Полацк IX–XVIII стст.: узнікненне, фарміраванне і развіццё (па археалагічных і пісьмовых крыніцах) : аўтарэф. дыс. ... докт. гіст. навук : 07.00.06 / Д. У. Дук ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011.

Стрэнкоўскі, С. П. Гарадское самакіраванне ў вялікакняжацкіх уладаннях заходняй часткі Вялікага княства Літоўскага ў XV–XVIII стагоддзях : дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / С. П. Стрэнкоўскі. – Мінск, 1999.

Стрэнкоўскі, С. П. Градское самакіраванне ў Беларусі (канец XIV–XVIII ст.): аўтарэф. дыс. ... докт. гіст. навук: 07.00.02 / С. П. Стрэнкоўскі. – Мінск, 2014.

Як зазначае гісторык А. М. Люты, другое дзесяцігоддзе XXI ст. стала часам, калі навуковы кірунак праблем генезісу капіталізму, працэсаў урбанізацыі і фарміравання беларускай нацыі пачаў выходзіць на якасна новы этап дзейнасці. У гэты час пачына-

юць з'яўляцца абагульняльныя дысертацыі па гістарыяграфіі. Важным метадалагічным зрухам стала выкарыстанне ў працах даследчыкаў кагнітыўнай тэорыі [1].

*Гістарыяграфічныя даследаванні:*

Сувалаў, А. М. Праблема этнагенезу беларусаў у гістарыяграфіі канца XVIII – пачатку XX ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / А. М. Сувалаў ; БДПУ. – Мінск, 2011.

Врублеўскі, Ю. У. Гістарыяграфія гісторыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў IX–XIII стст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / Ю. У. Врублеўскі ; БДПУ. – Мінск, 2013.

Актуальная праблематыка сучасных даследаванняў па пытаннях гарадской гісторыі:

- Месца і роля гарадоў у сістэме панавання феадальных і капіталістычных адносін;
- Распрацоўка гістарычнай канцэпцыі сутнасці феадальнага горада;
- Часавыя і прасторавыя характарыстыкі духоўнага аблічча гарадоў у іх развіцці;
- Этнаканфесійны склад гарадоў Беларусі часоў феадалізму;
- Роля гарадоў Беларусі ў працэсе фарміравання беларускай нацыі;
- Звычаі і светапоглядныя ўяўленні жыхароў гарадоў Беларусі;
- Феадальны горад як рэчаіснасць палітычных працэсаў;
- Распрацоўка сінтэзнага даследавання па гісторыі феадальнага горада;
- Спецыфіка развіцця гарадской інфраструктуры;
- Дэмаграфія горада.

Аналіз навуковай літаратуры (кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый) даў магчымасць звярнуць увагу на асаблівасці фарміравання новага кірунку даследавання ў гістарычнай навуцы «Гісторыя федальных гарадоў Беларусі», прасачыць сталасць яго характару і вызначыць паступовую мадыфікацыю яго зместу. Важнай з'явай для айчыннай навукі стала з'яўленне навукова-педагагічных школ і новых кірункаў даследаванняў.

### Літаратура

1. Научно-педагогические школы БГПУ / под ред. А. В. Торховой. – Минск : БГПУ, 2015. – 260 с.